## Народная цацка - гэта найстаражытнейшы від народнага мастацтва, выразнік нацыянальнай культуры

Выхаванне падрастаючага пакалення не можа ажыццяўляцца па-за традыцыйнай культурай пэўнай нацыі. Этнічная гісторыя, гістарычная спадчына і культура продкаў выступаюць базавымі каштоўнасцямі для развіцця асобы.

Па меркаванні нідэрланскага гісторыка культуры Й. Хейзінга, натуральным і арганічным элементам чалавечай культуры, які ўдзельнічае ў стварэнні, ўзнаўленні, засваенні і апрадмечванні сацыяльнага вопыту папярэдніх эпох і пакаленняў, з’яўляецца гульня. Змяненне тыпу культуры і гульнявых форм у працэсе чалавечай эвалюцыі не змяняюць яе радавой сутнасці;  не залежна ад тыпу культуры яна застаецца адным з важных відаў дзейнаці асобы, «другой рэальнасцю», уключаючыся ў якую дзіця інтэрыярызіруе сацыякультурны вопыт папярэдніх пакаленняў, асвойвае нормы і каштоўнасці культуры этнасу[10].

Такім чынам, гульня - гэта гістарычна абумоўлены, натуральны і арганічны элемент культуры, частка культуры народа. Асвойваючы гульню, дзіця асвойвае і ўзбагачае гульнявую культуру нацыі, якая адлюстроўвае традыцыйныя і новыя формы гульнявых паводзін.

Неад'емным атрыбутам гульні з'яўляецца цацка, якую называюць «люстэркам культуры». Па ўсеагульным прызнанні, цацка ўяўляе сабой адну з фундаментальных універсалій чалавечага быцця, паколькі служыць для перадачы ў асаблівай «згорнутай форме» каштоўнасцяў культуры і вопыту пакаленняў, значэння і стану сучаснай цывілізацыі.

Цацка як частка дзіцячай гульнявой рэальнасці з'яўляецца незаменным сродкам інкультурацыі. Як піша В.У. Абраменкава, «цацка для дзіцяці - не проста забава, а духоўная прылада, з дапамогай якой  яно асвойвае вялізны і складаны свет, спасцігае законы чалавечых узаемаадносін і вечныя ісціны». Узнаўляючы рэальныя і ўяўныя рэчы і вобразы, цацка дапамагае дзіцяці

пазнаваць, даследаваць навакольны свет, фарміраваць і рэалізоўваць творчыя здольнасці, выказваць свае пачуцці, вучыць мець зносіны і спазнаваць сябе [1, 519].

Да нацыянальнай цацкі адносіцца, перш за ўсё, народная цацка – даступны эмацыянальны сродак народнай педагогікі.

Народная цацка - гэта найстаражытнейшы від народнага мастацтва, выразнік нацыянальнай культуры. У народнай цацкі не толькі акумуляваны вопыт многіх пакаленняў людзей, але і ўвасоблены асноўныя жыццёвыя каштоўнасці таго ці іншага народу, той ці іншай эпохі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Таму народная цацка, з'яўляючыся захавальнікам памяці народа, транслятарам яго гістарычных, культурных, рэлігійных традыцый, выступае для дзіцяці інструментам пазнання ўсяго багацця чалавечай і нацыянальнай культуры.

Далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да гэтага багацця, увогуле да культурнай народнай традыцыі мае асобую значнасць ў дашкольныя гады. Гэта звязана з тым, што дзіця, па меркаванні В.П. Зянькоўскага, Дз.С. Ліхачова, з’яўляецца тым паўнапраўным членам соцыума, якому ў будучым будзе прадстаўлена магчымасць развіваць, захоўваць і перадаваць наступным пакаленням культурную спадчыну свайго этнаса.

У культуралагічных і этналагічных крыніцах культурная народная традыцыя вызначаецца як з’ява духоўнага жыцця, элемент грамадскай і нацыянальнай свядомасці, які забяспечвае самаідэнтычнасць культуры пэўнага народу.

Даследчыкі В.Б. Уласава, І.А. Ільін, К.В. Чыстоў да тэарэтычных аспектаў культурнай традыцыі адносяць «душевно-духовный уклад народа» (К.Д. Ушынскі). Што да сучасных даследчыкаў, то яны вызначаюць працэс далучэння дзяцей да айчыннай культурнай традыцыі як выхаванне, бо менавіта выхаванне, ў адпаведнасці з палажэннямі сучаснай навукі, ўяўляе сабой аксіалагічны пачатак, звязаны з прыняццем дзецьмі асобасна значных

культурных каштоўнасцей (Б.М. Бім-Бад, А.В. Пятроўскі, Т.І. Петракова і іншыя).

Што да арганізацыі далучэння дзяцей да айчыннай культурнай традыцыі, то яна адбываецца праз педагагічную падтрымку дзіцяці ў яго духоўна-маральным самавызначэнні; праз пераўтварэнне асяроддзя адукацыйнай установы ў гульнявую выхаваўчую прастору, дакладней, у выхаваўчую прастору наладжвання адносін дзіцяці з сацыякультурным акружэннем .

Пры гэтым, па меркаванні В.С. Бараздзіной, адметнасць далучэння дашкольнікаў да айчыннай культурнай традыцыі ва ўстанове дашкольнай адукацыі звязана з прыярытэтным значэннем эмацыянальнай сферы ў станаўленні каштоўнасных арыентацый дашкольніка, яго вобразна-дзейнасным уяўленнем карціны свету; з гульнявым характарам жыццядзейнасці «культурааахоўваючай» (В.У. Абраменкава) і «культуратворчай» (В.Т. Кудраўцаў) функцыямі дзіцячай гульнявой субкультуры.

Працэс далучэння дашкольнікаў да айчыннай культурнай традыцыі працякае, па зазначэнні В.В. Зяньkоўскага, больш эфектыўна ў «сферы гульні», якая ўключае ўсе аспекты жыццядзейнаці дзіцяці. Цацка, як самы істотны кампанент гульні, выконвае тут адукацыйную, развіваючую і выхаваўчую ролі. Асноўнае прызначэнне цацак у тым, каб даць дзіцяці магчымасць актыўна дзейнічаць, выражаць свае думкі і пачуцці, ствараць задуманыя вобразы. Што да народнай цацкі, то яна выступае не толькі як асноўны кампанент гульні, але і прадстаўляе сабой мастацкі сродак этнаграфічнага асяроддзя, які многа можа расказаць пра гісторыю краіны, пра яе звычаі, абрады традыцыі.

Як ўжо адзначалася, народная цацка з’яўляецца адным з вядучых кампанентаў культуры, «цудоўнай культурнай спадчынай», і ў той жа час яна выступае як кампанент гульнявой дзейнасці, як фактар этнаграфічнай

адукацыі малога дзіцяці. Змест і форма цацкі знаходзяцца ў непасрэднай сувязі з сацыяльным ладам грамадства, з узроўнем яго культуры.

Народная цацка, як і народная казка, народная песня, народная гульня, ўплывае на грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту, фарміраванне іх нацыянальнай самасвядомасці. Яна фарміруе ў іх цікавасць да традыцый свайго народа, да гісторыі яго жыцця. Маленькае дзіця, гуляючы з народнай цацкай, успрымае яе з дапамогай сенсорных аналізатараў і тым самым дачыняецца да мастацкіх асаблівасцей цацачнага вобраза, якія расказваюць яму пра адметнасці вытворча-гаспадарчай і святочна-абрадавай дзейнасці той этнічнай супольнасці, да якой яно належыць. Адным з агульнаадукацыйных значэнняў беларускіх народных цацак з'яўляецца тое, што, праз азнаямленне і гульню з імі, маленькае дзіця знаёміцца з якасцямі і ўласцівасцямі матэрыялаў, з якіх зроблены гэтыя цацкі: глінай, дрэвам, саломай і інш.

Народная цацка прысутнічае ў сучаснай дашкольнай установе ці у беларускім куточку, ці ў беларускай хатцы. Яна амаль што не выкарыстоўваецца ў самастойных гульнях дзяцей. З аднаго боку існуе неабходнасць удзелу народнай цацкі ў выхаваўчым працэсе, а з другога складанасць яе ўкаранення ў гэты працэс. Між тым ужыванне народнай цацкі разам з аваладваннем роднай мовай, успрыманннем фальклорных твораў фарміруе ў дзіцяці той «душевно-духовный уклад» ( К. Дз. Ушынскі), які спатрэбіцца яму ў далейшым жыцці.

Маленькае дзіця, гуляючы з народнай цацкай, радуецца жыццю, яна забаўляе дзіця, у ёй шмат гумару. Тут неабходна заўважыць, што ніякі іншы від народнай творчасці так актыўна і глыбока не выхоўвае ў дзіцяці нацыянальных рысы, эстэтычнае пачуццё, як народная цацка, якую дзіця любіць, з якой яно актыўна і творча дзейнічае. Як адзначае А.А. Флёрына, гэта звязана з тым, што праз народную цацку народ аддае сваю любоў і пяшчоту, сваю весялосць і смех, свае думкі і веды, сваё ўменне і менавіта ў гэтым такая вялікая сіла яе ўплыву на асобу малога дзіцяці.